Захарава − Захарава, В. Г. Тэрміналогія машынабудавання (катэгорыя працэсаў, дзеянняў) // Тэрміналагічны зборнік “84” / АН БССР; Тэрмінал. камісія АН БССР; ІМ; Рэд. Л. А. Антанюк. – Мінск : Нав. і тэх., 1986. − 56 с.

Зеленскі − Зеленскі, В. Ботаніка: Падруч. для сярэд. шк. / В. Зеленскі. – Коўна : Друк. бр. М. і Л. Гурвіч, 1924. − XV+159 с.

Кашын – Кашын, М. У. Слоўнік тэрмінаў / М. У. Кашын // Фізіка: першая ступень: у 2 ч. / пер. з 2-га рас. выд. А. Круталевіча ; Нар. камісарыят асьветы БССР – Масква – Ленінград : Дзярж. выд-ва, 1924. Ч. 1. – С. 176–179. − Ч. 2. – С. 223–224.

Купрэвіч − Купрэвіч, В. Лекавыя сродкі ў народнай мэдыцыне / В. Купрэвіч // Наш край. − 1930. − №4(55). Красавік. − С. 55–60.

Ластоўскі − Ластоўскі, В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / В. Ластоўскі. – Коўна : Друк. А. Бака, 1924. − XII+832 с.

СГПТ − Руска-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай тэрміналогіі / Склад. М. В. Бірыла [і інш.]; пад рэд. М. В. Бірылы і М. Р. Судніка. – Мінск : Нав. і тэхн., 1970. − 451 с.

Серада − Серада, С. Дзелавод. Узоры афіцыяльных папер. Слоўнік тэхнічна-канцэлярскіх выразаў і іншыя, патрэбныя ў дзелаводзтве веды / С. Серада; Пад рэд. М. Красінскага. – Мінск, 1926. − 135 с.

Станкевіч − Станкевіч, Я. Некаторыя праўніцкія тэрміны беларускія / Я. Станкевіч. – Нью-Ёрк : Крыв. навук. тав.-ва Ф. Скарыны, 1953. – 84 с.

Цвікевіч – Цвікевіч, І. Тэрміналёгічны слоўнік / І. Цвікевіч // Анатомія, фізіялогія і гігіена. – 3-е выд., папр. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1930. – 230 с.

ЭПБ – Руска-беларускі слоўнік-паказальнік назваў раслін (жывёл), пашыраных на Беларусі // Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. / Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 5. – Мінск : БелСЭ, 1985. – С. 498 − 572.

ЮТ − Юрыдычная тэрміналогія: праект / Інстытут Беларускай культуры. – Мінск : Інстытут беларускай культуры, 1926. – 53 с.

Р.В. Пашковіч
(настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Падсвільская сярэдняя школа Глыбоцкага раёна”)

СЛОВА Ў МОВЕ, ТЭКСЦЕ, НАВУЧАННІ

Мова – гэта сацыяльная з’ява, якая дзейнічае на працягу ўсяго існавання чалавечага грамадства. Асабліва вялікае значэнне мае мова ў выхаваўчай і асветніцкай дзейнасці людзей. «З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, людзей, самым выпрабаваным і надзейным было і будзе слова», – пісаў Васіль Вітка.

Слова – асноўная, цэнтральная адзінка мовы. Лексічнае значэнне слова – гэта змест, тое найважнейшае, што вызначае месца слова ў нашым маўленні, гэта прадукт мыслення чалавека. Паколькі ўсе моўныя з’явы так ці інакш звязаны са словам, можна гаварыць аб слове як аб сувязным звяне ў сістэме мовы. Гэта значыць, што ўзбагачэнне слоўнікавага запасу патрабуе адпаведных ведаў усіх раздзелаў мовазнаўства: фанетыкі, арфаэпіі, арфаграфіі, лексікі, словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу.

Репозиторий ВГУ

Мова выконвае дзве асноўныя функцыі: намінатыўную і камунікатыўную. Сістэма ў лексіцы грунтуецца на двух гэтых тыпах суадносін: камунікатыўная сістэма абапіраецца на элементы значэння слова, звязаныя з яго спалучальнасцю; намінатыўная сістэма мае ў сваёй аснове элементы значэння слова, звязаныя з яго прадметна-лагічнай суаднесенасцю.

Адсюль вынікае, што ў працэсе авалодання словам умоўна вызначаецца вербальна-семантычны ўзровень, накіраваны на авалоданне лексічнымі і лексіка-граматычным паняццямі: сінонімамі, антонімамі, амонімамі, мнагазначнасцю, часцінамі мовы і г.д.; тэзаўрусны ўзровень, накіраваны на навучанне практычнаму выкарыстанню гэтых паняццяў на ўсіх узроўнях: складанне сінанімічных радоў, антанімічных пар, лексіка-граматычных і тэматычных груп слоў; прагматычны ўзровень, накіраваны на забеспячэнне камунікатыўных патрэб школьнікаў, – стварэнне са словамі тэкстаў у розных сітуацыях маўлення, розных тыпаў і стыляў.

Слоўнікавы запас вучняў не з’яўляецца механічнай сукупнасцю асобных слоў, задачу яго ўзбагачэння нельга зводзіць да ўвядзення ў актыўны слоўнік асобных слоў і выразаў. Аснова ўзбагачэння слоўніка – авалоданне сістэмнымі сувязямі лексіка-семантычнага ўзроўню: уводзіны ў маўленчую свядомасць вучняў лексіка-граматычных, лексіка-семантычных, тэматычных груп слоў; асэнсаванне школьнікамі лексічнай і граматычнай спалучальнасці слоў, іх функцыянаванне ў тэкстах розных стыляў. Вызначэнне семантыкі і выяўленне асаблівасцей ужывання слоў з’яўляецца асновай слоўнікавай работы і праводзіцца з апорай на кантэкст.

З усяго сказанага вынікаюць прынцыпы ўзбагачэння слоўнікавага запасу: узбагачэнне слоўніка вучняў на аснове спасціжэння семантыкі і спалучальнасці слоў і на аснове функцыянавання слова ў маўленні (тэкстах пэўных тыпаў, стыляў).

Для рэалізацыі вышэйназваных задач выкарыстоўваю сістэму практыкаванняў, якая на вербальна-семантычным узроўні прадугледжвае знаёмства з пэўнымі лексічнымі і лексіка-граматычнымі паняццямі, іх актуалізацыю пры вывучэнні школьнага курса беларускай мовы, выяўленне семантыкі незразумелых слоў, фарміраванне фанетычна правільнага вымаўлення, засваенне арфаэпічных і інтанацыйных нормаў беларускай мовы; на тэзаўрусным узроўні прадугледжваю практыкаванні на падбор сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў да слова, стварэнне лексіка-семантычных, тэматычных груп слоў, ужыванне слоў у словазлучэннях, сказах; на прагматычным узроўні ўключаю практыкаванні на аналіз лексічных сродкаў у тэкстах розных стыляў і тыпаў. Прыкладныя тыпы заданняў і пытанняў: выдзеліце новыя словы ў тэксце і патлумачце іх лексічнае значэнне; складзіце сінанімічны рад да дадзенага слова; падбярыце антонімы да слова; адкажыце,чаму аўтар ужывае дадзенае

Репозиторий ВГУ

слова з усяго сінанімічнага рада; складзіце сказы, ужываючы пэўныя спалучэнні слоў; выпраўце моўныя памылкі ў тэксце, падбярыце словы на пэўную тэму. Такім чынам, базай для практыкаванняў па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу школьнікаў служаць словы і ўстойлівыя адзінкі, сістэмныя аб'яднанні слоў. У практыцы яны павінны папярэднічаць заданням, накіраваным на стварэнне выказвання.

Спрыяць узбагачэнню беларускай лексікі мэтазгодна з дапамогай сістэмы практыкаванняў вербальна-семантычнага, тэзаўруснага і прагматычнага характару, якія забяспечваюць правільнасць, дакладнасць, выразнасць і вобразнасць вуснага і пісьмовага характару.

На ўроках мовы стаўлю наступныя мэты: адукацыйную, практычную, развіццёвую і выхавальную. Адукацыйная мэта звязана з фарміраваннем ведаў пра сістэму мовы, практычная – з фарміраваннем уменняў і навыкаў. Развіццёвая – прадугледжвае найперш развіццё навыкаў маўленча-камунікатыўнай дзейнасці, інтэлектуальных здольнасцей, уяўленняў і памяці вучняў. Выхавальная мэта звязана на ўроках у першую чаргу з выхаваннем культуры мовы і эстэтычнага густу.

Мова – гэта яшчэ і канал псіхічнага, інтэлектуальнага развіцця чалавека. Вядома, мова і мысленне цесна звязаны. Значыць, развіваючы мову дзяцей, узбагачаючы яе разнастайнымі лексічнымі сродкамі, граматычнымі формамі і канструкцыямі, фарміруючы ўменне правільна будаваць звязнае выказванне, мы развіваем і інтэлектуальныя здольнасці.

Задача настаўніка роднай мовы не павінна зводзіцца толькі да прывіцця пэўных мовазнаўчых ведаў. Яна значна шырэйшая – навучыць размаўляць на роднай мове.

Сучасная канцэпцыя выкладання беларускай мовы вызначае камунікатыўна-дзейнасны падыход, калі мова асвойваецца, у першую чаргу, як сродак пазнання, камунікацыі, далучэння да культуры. На ўроках мовы злучаюцца ў адно цэлае лінгвістычны і мастацкі матэрыял, моўны і зместавы бакі твора. Вучні засвойваюць не толькі арфаграічныя і пунктуацыйныя правілы, а спасцігаюць змест твора, аўтарскую задуму праз фанетычныя, лексічныя і граматычныя асаблівасці мовы.Лічу, што настаўніку-славесніку нельга рэзка розніць урокі мовы і літаратуры, бо на адным і другім адбываецца сапраўднае спасціжэнне слова. Знаёмства са словам як сродкам мастацкай вобразнасці развівае ўменне адчуваць эстэтычную вартасць твора, а таксама выбіраць вобразныя моўныя сродкі пры стварэнні ўласных тэкстаў.

Тэкст як элемент моўнай сістэмы – гэта найбольшая адзінка сінтаксічнага ўзроўню, якая аб'ядноўвае адзінкі ўсіх узроўняў мовы агульнасцю задумы, мэт і ўмоў камунікацыі. Менавіта ў тэксце рэалізуюцца значэнні ўсіх моўных адзінак. Пры пабудове тэксту неабходна

Репозиторий ВГУ

ўлічваць, з якой мэтай ён ствараецца, хто яго адрасат, якую сферу дзейнасці абслугоўвае, у якой сітуацыі будзе ўспрымацца, у якім стылі будзе напісаны. Тэкст характарызуецца наступнымі прыметамі: сэнсавай цэласнасцю, тэматычным адзінствам, звязнасцю, разгорнутасцю, паслядоўнасцю і завершанасцю. Тэксты служаць узорам і стымулам пабудовы самастойнага выказвання, дэманструюць функцыянаванне моўных адзінак усіх узроўняў. Першае знаёмства з тэкстам – гэта чытанне. Чытанне стварае магчымасць для ўдасканалення слоўніка праз папаўненне і ўзбагачэнне лексічнага запасу, з'яўляецца сродкам выпрацоўкі арфаэпічных уменняў і навыкаў. У працэсе чытання скіроўваю ўвагу на ўдасканаленне ўменняў якасна пераапрацоўваць прачытанае, аналізаваць, асэнсоўваць у адпаведнасці з устаноўкай: выяўляць пазіцыю аўтара, разумець праблематыку тэкстаў, аналізаваць і асэнсоўваць прачытанае. Праводжу працу аналітыка-сінтэтычнага характару, вучу назіраць за спосабамі выказвання думкі: вызначаць асаблівасці ўжывання аўтарам лексічных сродкаў, пэўных граматычных формаў, характар сінтаксічных канструкцый. Праводжу слоўнікавую працу: тлумачу лексічнае значэнне незразумелых слоў. Развіццю камунікатыўных уменняў садзейнічаюць традыцыйныя метады і прыёмы (аналіз і пераказ тэкстаў, складанне творчых маналогаў і дыялогаў, разгорнутыя і сціслыя адказы на пытанні).

Пры рабоце з тэкстам на кожным уроку мовы вучням прапаноўваю наступныя заданні: прыдумаць два загалоўкі да тэксту, каб адзін адпавядаў тэме, а другі – ідэі; прыдумаць працяг тэксту; размясціць абзацы так, каб атрымаўся тэкст, скласці план тэксту, прачытаць тэкст і скласці пытанні да яго; падрыхтавацца да падрабязнага (сціслага) пераказу тэксту; знаходжанне сказаў, якія выражаюць асноўны сэнс паведамлення і якія яго пашыраюць; разгортванне сэнсу частак шляхам далучэння самастойна складзеных сказаў; увядзенне ў тэкст новых сказаў. Вучням даю заданне пашырыць тэматычны сказ абзаца, папоўніць яго, падабраўшы патрэбную інфармацыю, разгарнуць думку, прывесці свае прыклады.

На ўроках адбываецца развіццё маўленчых здольнасцей вучняў. Задача – не толькі даць веды па пэўнай тэме, навучыць школьніка будаваць пісьмовыя ці вусныя выказванні, але і фарміраваць уменні якасна ўспрымаць і апрацоўваць інфармацыю, будаваць выказванне ў залежнасці ад мэты, умоў зносін. У сувязі з гэтым, на маю думку, мэтазгодна на занятках актыўна практыкаваць розныя вучэбныя сітуацыі з пэўнымі маўленча-камунікатыўнымі намерамі, якія адлюстроўваюць працэс суразмоўніцтва, мадэліруюць моўныя паводзіны чалавека ў розных жыццёвых сітуацыях. Важнае значэнне таксама мае прыём апісання камунікатыўнай сітуацыі і актыўнае ўключэнне вучняў у ролевую гульню.

Репозиторий ВГУ

Валоданне камунікатыўнымі навыкамі складае неабходны кампанент адукаванасці чалавека і з'яўляецца паказчыкам яго агульнай культуры. А таму менавіта развіццю камунікатыўных навыкаў, фарміраванню культуры вуснай мовы надзяляю вялікую ўвагу ў сістэме навучання.

Літаратура

1. Валочка, Г.М. Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках мовы / Г.М. Валочка. – Мінск, 2005.
2. Васюковіч, Л.С. Вучэбны тэкст у школьным падручніку / Л.С. Васюковіч. – Мінск, 2005.
3. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы / В.А.Ляшчынская, З.У. Шведава. – Мінск, 2007.
4. Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / С.В. Мартынкевіч. – Мінск, 2010.
5. Методыка выкладання беларускай мовы / М.Г. Яленскі (і інш.); пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск, 2007.
6. Даніч, А.У. Родная мова як сродак выхавання асобы вучня: грамадзянска-патрыятычны аспект / А.У. Даніч, В.М. Карчагіна // Современное образование Витебщины. – 2016. – №1 (11).

К.С. Півавар

(старшы выкладчык кафедры замежных моў
Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны)

СЛОЎНІКАВЫ АРТЫКУЛ "БРАНІСЛАЎ ТАРАШКЕВІЧ" У ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧЫМ СЛОЎНІКУ

Нацыянальна-культурная адметнасць моўнага матэрыялу даўно стала прадметам увагі айчынных і замежных лінгвістаў, у тым ліку і лексікографаў. Адметныя ў этнакультурных адносінах моўныя факты паступова збіраліся, назапашваліся і сістэматызаваліся, у выніку чаго з'явіліся выданні новага тыпу – лінгвакраіназнаўчыя слоўнікі (даведнікі). Дадзеныя слоўнікі фіксуюць рэаліі побыту, гісторыі, культуры, прыроды той ці іншай краіны і іх моўную рэпрэзентацыю. Асаблівае месца ў такіх выданнях належыць прэцэдэнтным імёнам. Да прэцэдэнтных імёнаў прынята адносіць вядомыя большай частцы прадстаўнікоў пэўнай лінгвакультурнай супольнасці ўласныя імёны, якія ўваходзяць у яе кагнітыўную базу, актуальныя ў працэсе камунікацыі, мастацкім, публіцыстычным дыскурсах і сведчаць пра нацыянальную ідэнтычнасць нашага народа. Прэцэдэнтнае імя можа быць звязана з шырокавядомым тэкстам або паказальнай сітуацыяй, якая змяшчае ў сабе тыя ці іншыя культурна-гістарычныя канатацыі. Мэта артыкула: выявіць крытэрыі ўключэння антрапонімаў у лінгвакраіназнаўчы слоўнік і на прыкладзе

Репозиторий ВГУ